22.05 Шесть новостей дня.
22.15 Те Кто.
22.30 Телемагазин в Минске.
23.05 Сериал **«Попутчик»**.
23.30 «Знак качества».
23.40 Сериал **«Грейс в огне III»**.

8 канал

18.00 Программа Кеннета Коупленда.
18.25, 20.25 У стойки бара.
18.30 Детский экран.
19.00 Сериал **«Горец»**.
20.00 Док. экран.
20.30 Вечарніца.
20.45 Сериал **«Лабиринты любви»**.
21.40 Погода на завтра.
21.45 Отбой.
21.55 У стойки бара.
22.00 Комедия **«Берегись автомобиля»**.
23.45 Погода на завтра.

ПЯТНИЦА • 27 АВГУСТА

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00 Новости.
8.15 Политические диалоги.
8.40 Потребительская корзина.
9.00 Новости.
9.10 Телебарометр.
9.25 Мультфильм.
9.40 Королевская охота.
10.10 Уроки Н.Новожиловой.
10.35 Усадьба.
11.00 Новости.
11.10 Новые имена.
11.18 **«Верность любви»**. Сериал.
12.00 К Дню Независимости Молдовы. «Молдова: год - страница в истории».
12.10 Сделано в Беларуси. Производственное объединение «Нафтан».
12.25 Бон тон. Тележурнал моды.
13.00 Новости.
13.15 Дневной сеанс. **«У чертова логова»**. Худ.фильм.
14.35 Концерт мастеров искусств Молдовы («Молдова ТВ»).
15.00 Новости.
15.15 Сериал для детей **«Девочка и океан»** (Австралия).
15.40 Мультфильмы.
16.00 Регион. Передача из Витебска.
16.25 «Риск-версия». Телеигра.
17.00 Новости (с сурдопереводом).
17.15 «А музыка звучит...» Поют солисты Государственного театра музыкальной комедии Республики Беларусь.
17.40 Наш край. «История и быт украинцев в Беларуси».
18.05 **«Верность любви»**. Сериал.
18.50 Новые имена.
19.00 Новости.
19.15 «Сегодня с вами...» Генеральный директор Национального парка «Браславские озера» Петр Михолап.
19.40 Международные спортивные новости.
20.00 Добрый вечер, Беларусь! В программе: «Разговор в прямом эфире», «Что делать?», рубрика «Зоовести».
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 Творческий вечер поэтов Е.Туровой (Беларусь) и А.Шаганова (Россия) на «Славянском базаре в Витебске-99».
0.15 Криминальная хроника.
0.20 Белорусский хит-парад.
0.25 Новости.
0.35 Футбол. Чемпионат Беларуси. «Шахтер» (Солигорск) - «Гомель». 2-й тайм.

ОРТ

08.00, 11.00, 14.00, 17.00, 22.30 Новости.
08.15 Сериал **«Во имя любви»**.
09.15 Маски-шоу.
09.40 Смак.
10.00 Звезды хоккея на Кубке «Спартака».
13.30 Программа «Вместе».
14.15 Киносказка Рэя Брэдбери **«Что-то страшное грядет»**.
15.45 Мультсеанс.
16.00 Сериал **«Во имя любви»**.
17.15 Джентльмен-шоу.
17.45 Светлана Крючкова в программе «Женские истории».
18.15 Док.детектив. «Засада на таможне». Дело 1997 года.
18.45 Поле чудес.
19.45 «Спокойной ночи, малыши!».
20.00 Время.
20.40 Погода.
20.45 Клуб «Белый попугай».
21.25 Футбол. Суперкубок Европы. «Лацио» (Италия) - «Манчестер Юнайтед» (Англия).
23.50 Худ. фильм **«Огневая мощь»**.

РТР

06.00 Доброе утро, Россия.
06.20 У всех на устах.
06.45 Телеигра «Программа передач».
07.15 Тысяча и один день.
08.15, 23.20 Дежурная часть.
08.45 Товары - почтой.
09.10 **«Миледи»**. Сериал.
10.00, 16.00, 19.00, 23.35 Вести.
15.25 **«Первые поцелуи»**. Сериал.
16.30 «Башня».
16.55 **«Лето нашей тайны»**. Сериал.
17.50 «Устами младенца». Телеигра.
18.20 Осторожно, модерн!
19.40 Подробности.
19.55 «Аншлаг» и Ко.
20.55 Музыкальный ринг - новое поколение.
22.35, 00.05 Чемпионат мира по легкой атлетике (Испания).
01.05 Магазин на диване.
01.20 Прогноз погоды.

07.05, 11.30, 13.30, 19.30, 23.00 Новости культуры.
07.25 «Никс и Кукры». Док.фильм.
08.05 Играет оркестр «Филармония наций».
08.25 «Консилиум».
08.50 Поклонникам Терпсихоры.
09.00, 21.35 **«Игры для детей школьного возраста»**. Худ. фильм.
10.20 «Российский курьер». Смоленск.
11.00 Леонид Андреев. Передача 3-я.
11.40, 19.50 После новостей...
12.00 «Лошарик». Мультфильм.
12.10 «Театральная династия». Авторская программа В.Я.Лакшина.
13.45 Вечные образы искусства.
14.10 «Гробовщик». Телеспектакль.
15.00, 17.30 Новости.
15.10 «Лукоморье».
15.30 Сериал **«Ночи и дни»**.
16.25 Живое дерево ремесел.
16.35 Дайте, дайте мне Раневскую.
17.40 «Очевидное - невероятное. Век XXI». Ведущий С.П.Капица.
18.10 Страна Фестивалия.
18.40 «Избранное-2000». Часть 1-я.
19.15 Чудо-сказка.
20.10 «Избранное-2000». Часть 2-я.
21.05 Дмитрий Хворостовский в «Новой опере».

НТВ

06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00 Сегодня утром.
06.10, 07.15 Спорт.
06.15, 07.20 Погода.
06.20 Градусник.
06.25, 07.45, 14.20 Сегоднячко.
06.35 Мультфильм.
06.45 Карданный вал.
06.50, 16.30 Впрок.
07.25, 17.40 Криминал.
07.35 Я - телохранитель.
08.10 Сериал **«Солдаты удачи»**.
09.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00 Сегодня.
09.20 Детектив **«Конец операции «Резидент»**. 1-я серия.
10.35 Мультфильм «Боцман и попугай».
11.30 «Старый телевизор» вспоминает...
13.30 Сериал **«Доктор Куин, женщина-врач»**.
15.30 Сериал **«Захватчики»**.
16.55 Футбольный клуб.
18.45 Детектив **«Конец операции «Резидент»**. 2-я серия.
20.05 Намедни-86.
21.45 «Криминальная Россия». «Погоня за призраками». 2-я серия.
22.20 Сериал **«Солдаты удачи»**.
23.10 Худ. фильм **«Смерть и девушка»**.
00.55 Чемпионат мира по шахматам.

TV6 МОСКВА

05.55, 12.05 День за днем.
07.45, 17.15 Дорожный патруль.
08.00, 10.00, 12.00, 14.00 ТСН-6.
08.10, 23.10 Те Кто.
08.25 СВ шоу.
08.50, 11.50 Телемагазин в Минске.
09.00 Сериал **«Защитница»**.
10.05 Наша музыка. В.Леонтьев.
11.05 Сериал **«Вавилон 5»**.
14.05 Мультфильм «Осень».
14.15 Телемагазин в Минске.
14.40 Сериал **«Просто Мария»**.
15.30 Мультсериал «Серебряный конь».
15.55 Сериал **«Приключения Шерли Холмс»**.
16.25 ДИСК-канал.
17.00 ТСН-6.
17.30 Сериал **«Грейс в огне IV»**.
18.00 «Шоу Бенни Хилла».
19.00 «Новости дня».
19.30 «Скандалы недели».
20.00 «ОБОЗ».
20.55 Боевик **«Собачья свара»**.
22.40 Дорожный патруль.
22.55 Шесть новостей дня.
23.25 «Радио хит».
00.25 «Знак качества».
00.35 Сериал **«Грейс в огне IV»**.

8 канал

18.00 Программа Кеннета Коупленда.
18.25 Мой дом, моя крепость.
18.30 Худ. фильм **«Прикосновение»**.
20.15 Док. экран.
20.25 Мой дом, моя крепость.
20.30 Вечарніца.
20.45 Сериал **«Странные истории»**.
21.40 Погода на завтра.
21.45 Между прочим.
21.55 Мой дом, моя крепость.
22.00 Худ. фильм **«Белоснежка»**.
23.45 Погода на завтра.

СУББОТА • 28 АВГУСТА

БТ

7.00 Доброе утро, Беларусь!
8.00 Континент. Обзор международных событий.
8.15 Столица. Информационно-аналитическая программа.
8.40 Потребительская корзина.
9.00 Новости.
9.15 Родное слово. Тележурнал.
9.45 Слово Митрополита Филарета на праздник Успенья Пресвятой Богородицы.
10.00 «Сегодня с вами...» Главный режиссер Могилевского областного театра кукол О.Жюгжда.
10.25 Здоровье. Тележурнал.
10.50 Мультфильмы.
11.25 Компьютерный полигон.
11.50 «Все нормально, мама!» Развлекательная программа.
12.25 Международные спортивные новости.
12.45 Усадьба.
13.10 Новые имена.
13.15 Сериал по выходным. **«Династия-2. Семья Колби»**.
14.00 Четвертое измерение.
14.25 Олимп.
15.00 Новости.
15.10 Познай себя. «Психология мужчины».
15.30 «Все мы родом из детства». Четвертый Всебелорусский телефестиваль юных талантов (г.Минск). Часть 1-я.
16.25 Теннис. Международный мужской профессиональный турнир «Фьючерс».
16.55 «По заповедным местам Беларуси».
17.20 Ток-шоу «Это моя работа». Ко Дню знаний.
17.50 КВН. Дайджест.
19.10 «Песню берите с собой». Телефестиваль белорусской песни.
20.00 Новые имена.
20.05 Бездельник.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Романтическая комедия **«Напиток любви №9»** (США).
23.15 Белорусский хит-парад. Итоги недели.
23.30 Видимо-невидимо.
0.40 Теннис. Международный мужской профессиональный турнир «Фьючерс».

ОРТ

06.45 Кинокомедия **«Единица «с обманом»**.
08.00 Мультсеанс.
08.25 Слово пастыря. Митрополит Кирилл.
08.45 Домашняя библиотека.
09.00, 14.00, 16.45, 22.30 Новости.
09.15 Программа «100%».
09.45 «Утренняя почта».
10.20 Смак.
10.40 Здоровье.
11.10 Возвращение Третьяковки. История одного шедевра.
11.35 Возможно все!.
11.55 Худ.фильм **«На тебя уповаю»**.
13.25 «Каламбур».
14.15 В мире животных.
14.55 Как это было. Золото крейсера «Эдинбург». 1981 год.
15.40 Футбол. Чемпионат России. «Торпедо» - «Зенит».
18.00 Комедия **«Ассоциация злоумышленников»**.
20.00 Время.
20.50 Телесериал **«Секретные материалы»**.
22.45 Худ.фильм **«Счастливого Рождества, мистер Лоуренс!»**.

РТР

07.30 Папа, мама, я - спортивная семья.
08.30 «Устами младенца». Телеигра.
09.00 Доброе утро, страна.
09.30 Сам себе режиссер.
10.00 «Сто к одному». Телеигра.
10.45 Клуб «Белый попугай».
11.15 Хорошие новости.
11.40 Золотой ключ.
12.00, 20.00 Вести.
12.20 Федерация.
13.00 Урмас Отт с О.Романцевым.
14.00 Здоровье моей семьи.
15.00 «Слушается дело».
16.00 Дежурная часть.
16.30 Досье. «Дети подземелья».
17.00 Моя семья.
18.05 «Два рояля».
18.50 Худ. фильм **«Экспресс на Плимут»**.
20.40 Народная драма **«Любить по-русски-2»**.
22.25 Чемпионат мира по легкой атлетике (Испания).
23.45 Худ.фильм **«Избирательное сродство»**.
01.20 Скорость.

К

09.10 «Читая Библию». Ветхий Завет.
09.20 Книжный кладезь.
09.35 «Мировая деревня». «Борковский припев».
09.50 **«Машенька»**. Худ.фильм.
11.00 «Мастерская». М.Лавровский.
11.30 **«Тихоокеанский век»**. Док. фильм. Фильм 6-й. «Япония инкорпорейтед».
12.30 «Аистенок».
13.00 Времена не выбирают.
13.30, 21.00 Новости культуры.
13.45 **«Моя любовь»**. Худ.фильм.
15.00 О.Аросева... и другие.
16.00 Мультфильмы.
16.15 «Детский мир». М.Симонова.
16.45 «Посольские вечера». «Геликон-Опера» в доме посла США.
17.30 Новости.
17.35 «Соблазны». Спектакль.
18.40 Камеи Петра Зальцмана.
18.45 «15-й подъезд». Ведущий В.Васильев.
19.10 Чудо-сказка.
19.20 Док.фильмы.
20.10 Уинтон Марсалис в программе «Однажды в Кусково».
21.20 Блеф-клуб.
21.55 **«Извините, пожалуйста»**. Худ. фильм.

НТВ

07.00, 09.00, 11.00, 15.00, 18.00, 21.00 Сегодня.
07.15 Детектив **«Конец операции «Резидент»**. 2-я серия.
08.30 Мультфильм «Премудрый пескарь».
08.40 **«Фитиль»**.
09.15 Криминал. «Чистосердечное признание».
09.40 Своя игра.
10.05 Сериал **«Конан»**.
11.20 Впрок.
11.40 Добро пожаловать!
12.25 Художественный фильм **«Право на выстрел»**.
14.00 Мультфильм «Загадка Сфинкса».
14.10 Суд идет.
15.30 Сериал **«Она написала убийство»**.
16.30 «Антропология». Программа Д.Диброва.
17.20 Дог-шоу «Я и моя собака».
18.40 Худ. фильм **«Деревенский детектив»**.
20.20 Весь Жванецкий.
21.45 Худ. фильм **«Китайская шкатулка»**.
23.45 Чемпионат мира по шахматам.
23.55 «Футбольный клуб».
00.40 Ток-шоу «Про это».

TV6 МОСКВА

07.05, 17.30 Дорожный патруль.
07.20 Мультфильм «Сверчок».
07.30 Мультсериал «Сказки братьев Гримм».
07.55 Сериал **«Театр сказок»**. **«Русалочка»**.
08.50 Сериал **«Робин Гуд»**.
09.45 Шоу «Чердачок».
10.05 Путешествия с «Национальным Географическим Обществом». «Загадки человечества».
11.05, 11.35, 16.10 Телемагазин в Минске.
11.45 Худ.фильм **«Раба любви»**.
13.25 «Нью-Йорк, Нью-Йорк».
13.50 «Это - Жириновский!».
14.15 «О.С.П-студия».
15.10 Сериал **«Флиппер III»**.
16.00 ТСН-6.
16.20 Ток-шоу «Я сама». «Мой муж - сущий ребенок».
17.10 «Любишь - смотри». Видеоклипы.
17.45 Сериал **«20 тысяч лье под водой»**.
18.35 СВ шоу.
19.10 Детектив **«Клиент»**.
21.15 Худ.фильм **«Маэстро вор»**.
22.35 Те Кто. Gays & lesbians.
23.00 Дорожный патруль.
23.10 Шесть новостей дня.
23.20 «Звездная ночь».
23.55 Плейбой.

8 канал

15.00 Джойс Майер «Жизнь в слове».
15.30 Детский экран.
16.30 Палитра.
16.55, 19.25, 21.40 Двенадцать стульев.
17.00 Худ. фильм **«Джефферсон в Париже»**.
19.15 Мультпланета.
19.30 Худ. фильм **«Тихие шаги смерти»**, 1-2-я части.
21.15 Вечарніца.
21.30 Музыка на телеканале...
21.45 Худ. фильм **«Марс атакует»**.

ВОСКРЕСЕНЬЕ • 29 АВГУСТА

7.00 Доброе утро, Беларусь!
8.00 Сериал для детей **«Добрый дивный день»**.
8.30 Мультфильм.
8.40 Потребительская корзина. Социально-экономическая программа.
9.00 Новости.
9.10 «Я рисую».
9.25 «Навстречу».
9.40 Туробъектив. Путешествия, встречи, отдых.
10.05 «Все нормально, мама!» Развлекательная программа.
10.40 «Вся жизнь - через око объектива». Фотохудожник Юрий Иванов.
11.20 Арсенал. Программа об армии.
11.45 Международные спортивные новости.
12.05 Сделано в Беларуси. Профилактический лекарственный препарат «Фитогор».
12.20 Телевизионный Дом кино.
12.45 «Где-то в центре Европы». Док. фильм (ТО «Телефильм»).
13.10 Новые имена.
13.20 Сериал по выходным. **«Династия-2. Семья Колби»**.
14.05 Сельчане. Гродненская область. Передача из Гродно.
14.35 Новости.
14.50 Чемпионат мира по автогонкам «Формула-1». Гран-при Бельгии. Прямая трансляция.
17.05 Поэтические новеллы. «Единственная, любимая моя...»
17.20 Мультфильм.
17.35 Семейный кинозал. В.Соломин и Л.Азолиня в худ.фильме **«Он, она и дети»**.
18.50 Новые имена.
18.55 Теленавигатор.
19.15 Стадион.
19.40 Колыбельная.
20.00 Резонанс.
20.50 Ток-шоу «Карамболь» с участием Александра Пескова.
21.25 Мелодрама **«29-я улица»**.
23.05 Премьера песни.
23.15 Авто-парк.
23.25 Мотоспорт. «Супербайк-99».

06.45 Худ. фильм **«Восемь дней надежды»**.
08.00 Крестьянские ведомости.
08.30 «Утиные истории».
09.00, 14.00 Новости.
09.15 Пока все дома.
09.50 Утренняя звезда.
10.40 «Непутевые заметки» Дм.Крылова.
10.55 Служу России!
11.25 Играй, гармонь любимая!
11.55 Комедия **«Шаг навстречу»**.
13.20 Смехопанорама.
14.15 Клуб путешественников.
15.00 Футбольное обозрение.
15.35 «Чип и Дейл».
16.05 «Аладдин».
16.30 «КВН - ассорти».
17.00 Приглашает Концертная студия «Останкино». Илья Глазунов.
18.00 «Ералаш».
18.10 Худ.фильм **«Табор уходит в небо»**.
20.00 Время.
20.30 Погода.
20.35 Боевик **«На расстоянии удара»**.
22.25 Елена Яковлева в программе Андрея Макаревича «Абажур».
22.55 Сериал **«Майк Хаммер: смерть высшей пробы»**.

07.00 Служу Отечеству!
07.25 Прогноз погоды.
07.35 «Ключ». Мультфильм.
08.30 Почта РТР.
09.00 Доброе утро, страна.
09.30 «Аншлаг» и Ко.
10.30 «Фонтан». Юмористическая программа.
11.00 Русское лото.
11.40 Мир книг с Леонидом Куравлевым.
12.00 Вести.
12.20 «Планета людей». Мультфильм.
13.00 **«Закон и порядок»**. Сериал.
14.00 Диалоги о животных.
15.00 Старая квартира. Дайджест. 70-е годы. Часть 3-я.
16.00 Док.фильм «Голоса».
17.00 Комедия **«Гараж»**.
19.00 Зеркало.
20.00 Худ.фильм **«Стук сердца»**.
21.50 «К-2» представляет: Александр Филиппенко в программе «Перпендикулярное кино».
22.50, 00.20 Чемпионат мира по легкой атлетике (Испания).
00.00 Вести.

09.10 «Читая Библию». Новый Завет.
09.20 **«Поющее, звенящее деревце»**. Худ. фильм.
10.30 Откуда музыка берется?
10.45 «Консилиум».
11.10 **«Вероломство»**. Худ.фильм.
12.15 А.П.Чехов. «На чужбине». Исполняет М.Козаков.
12.30 «Аистенок».
13.00 «Экспедиция «Чиж».
13.30, 21.00 Новости культуры.
13.45 «Дом актера». «Традиции дома». Часть 2-я.
14.10 **«Александр Невский»**. Худ. фильм.
15.55 «Здесь осталась его душа». Художник Марк Шагал.
16.30 Телесуфлер.
16.50 «Князья, гусары, Мефистофель и пацак, или Герой не нашего времени». Юрий Яковлев.
17.30 Новости.
17.35, 19.20 Опера Дж.Верди «Набукко».
19.05 Чудо-сказка.
20.30 «Сапожник и русалка». Мультфильм для взрослых.
21.25 «Дорога на «Маяк». Док.фильм.
22.50 Голоса старого дома.

07.00, 09.00, 11.00, 15.00, 18.00, 21.00 Сегодня.
07.15 Худ. фильм **«Рядовой Александр Матросов»**.
08.40 «Фитиль».
09.15 Худ. фильм **«Деревенский детектив»**.
10.45 Мультфильм «Свирепый Бамбр».
11.20 Телеигра «Пойми меня».
11.50 Худ. фильм **«Повесть о гремучей змее»**.
12.25 Мультфильм «Ох и Ах идут в поход».
12.35 Детектив **«Анискин и Фантомас»**.
15.30 Профессия - репортер. Сергей Гапонов. «Хакеры в законе».
15.45 Свадьба.
16.15 Сериал **«Она написала убийство»**.
17.05 Док. сериал «Неизвестная война». Фильм 14-й. «Освобождение Белоруссии».
18.40 Боевик **«Америкэн бой»**.
20.40 «Куклы».
21.45 Худ. фильм **«Эксперимент «Карнозавр»**. 3-я серия.
23.15 Чемпионат мира по шахматам.
23.25 Худ. фильм **«Прощай, Эммануэль»**.

07.05, 17.30 Дорожный патруль.
07.20 Мультфильм «Софус отправляется в полет».
07.30 Сериал **«Театр сказок»**. **«Гензель и Гретель»**.
08.25 Сериал **«Робин Гуд»**.
09.20 Телемагазин в Минске.
10.00 Вкусная передача «Пальчики оближешь».
10.30 Канон.
11.00 Шесть новостей недели.
11.30 Худ. фильм **«Обет рыцарей Дельты»**.
13.15 Мультфильм «Война птиц».
14.25 «Чтоб сказку сделать». Док. фильм.
14.50 «Спартак» - чемпион!».
15.20 «Звезды о звездах». Л. Квинт.
15.45 «Знак качества».
16.35 Катастрофы недели.
17.50 Программа «БИС».
18.20 «Вы - очевидец».
18.55 «Обозреватель».
19.50 Худ. фильм **«Диана - королева сердец»**.
21.45 Наша музыка. В.Меладзе.
22.45 ТСН-Спорт.
23.00 Эротический триллер **«Массажистка-2»**.

15.00 Программа Рика Реннера.
15.30 Детский экран.
16.30 Худ. фильм **«Футболист»**.
17.55, 21.10, 21.40 Весь мир на ладони.
18.00 «Блаженны миротворцы». Программа с сурдопереводом.
18.30 Мультфильм «Земля до начала времени».
19.45 Криминальная программа Вл.Новицкого «Атас!!!».
20.15 Худ. фильм **«Тихие шаги смерти»**, 3-я часть.
21.15 Вечарніца.
21.30 Отбой.
21.45 Худ. фильм **«Марсельский клан»**.

НАЗІРАЛЬНІК

«Разговоры» стихнут скоро...

Валентина ТАРАН

Белорусская программа государственного радио «Разговор по существу», о котором уже шла речь на страницах НАВІНАЎ, является прямой калькой политической программы «Разговор со страной» российского частного канала «Радио-1». Оригинал, как и положено, выглядит много ярче белорусской копии.

Широкий спектр приглашаемых российских политиков, разнообразие мнений и оценок, сенсационные разоблачения коррупционеров, огромное число звонящих с диаметрально противоположными высказываниями... Значительную, если не преобладающую часть слушательской аудитории, составляют наши земляки. Они ежедневно висят на телефонах именно этой радиостанции, делясь своими мнениями-сомнениями по всем предложенным вопросам. Существуя в едином с соседней страной информационном пространстве, жители Беларуси до хрипоты спорят, как же им обустроить Россию, кого избрать президентом (Примакова или Зюганова; преемник Путин им в страшном сне не снился), по какому экономическому пути двигаться...

Похоже, пока политики двух стран с переменным успехом имитируют перетягивание каната при создании некого конгломерата — «единого государства с сохранением полного суверенитета каждой из сторон», препираются, кому возглавлять новое образование, а кому ждать своей очереди на скромном посту вице-президента — белорусские слушатели «Радио-1» для себя всё уже решили: они живут в российских Бобруйске, Бресте или Минске... Такая позиция всячески поощряется ведущими «Разговора со страной», который в течение минувшего года вели поочередно два журналиста: прокоммунистически настроенный Юрий Строев и декларирующий свою не ангажированность, а фактически обслуживающий интересы Евгения Примакова Павел Ващанов. Оба они, конечно, сторонники возрождения великой державы, что понятно, но «разговор», исходя из личного менталитета, строят по-разному. Ващанов — мягко, тактично, ностальгируя по огромной стране, Строев — агрессивно и запологошено, пугая и предупреждая о возможности неотвратимых последствий в случае промедления объединительных процессов. Поскольку «тутэйшы» его коллега Юрий Дудинов за образец для подражания в местном «Разговоре» избрал манеру поведения и ведения своего московского тезки, будет небезинтересно тем нашим читателям, которые лишены возможности в рабочее время беседовать не только «по существу», но и «со страной», узнать, о чем же там толкуют.

Вот пару образчиков. По весне обозреватель, сославшись на крупных аналитиков из Межпарламентской ассамблеи, раскрыл тайну выдвижения на оппозиционных майских выборах в белорусские президенты третьего кандидата (кроме Зенона Пазьняка и Михаила Чигиря). Ни за что не догадаетесь о ком речь! Прервав передачу, как великую сенсацию, Юрий Строев сообщил, что дочь популярного по сей день бывшего первого секретаря ЦК КПБ, готовясь к выдвижению, ходит по Москве и собирает под свое крыло сторонников и потенциальных спонсоров, подбирает имиджмейкеров. Аналитики, конечно, объяснили дочери отца, что не гоже лезть поперед Батьки в пекло, этим, мол, можно нанести непоправимый вред общему делу объединения народов. Тем более, что, по сведениям тех же аналитиков, в апреле некие необозначенные спецслужбы должны были спровоцировать в крупных городах Беларуси массовые выступления трудящихся, вероятно, обеспокоенных продолжающимся ростом промышленного производства, по смещению с поста белорусского президента. Такая вот страшилка для слабонервных. Правда, Наталья Петровна Машерова в сенсационно-злополучный московский радиодень находилась вовсе не в белокаменной, а в родном Минске, и даже была удостоена сюжета по БТ, участвуя в отнюдь не раскольническом мероприятии.

Не менее горячей новостью стало сообщение того же Юрия Строева об увольнении с работы двух «очень близких к оппозиции» высокопоставленных силовых чиновников. И не пытайтесь определить этих самых лиц, не получится! С ужасным придыханием сообщил слушателям обозреватель о том, что белорусский президент отправил в отставку главу своей охраны Бородича и министра внутренних дел Агольца. Увольнение, как известно, имело место. Однако вызывает сомнение качество аналитических и информационных источников студии «Радио-1» в связи с подозрением указанных лиц в желании строить некие козни бывшему шефу. Даже обидно за людей: так старались, так служили, а их в заговорщики по дружественному радио определили... Жуть!

Оплошавший со своими лжесенсациями ведущий надолго исчез из эфира, и теперь все эфирное пространство занимает значительно более тонкий и умный Павел Ващанов. Который, несмотря на свои генетически сложившиеся имперские амбиции, не устает удивляться стремлению звонящих ему белорусов объединяться с нынешней коррумпированной, пораженной организованной преступностью, экономически слабой, политически неуравновешенной Россией. И они отвечают на его недоуменные вопросы по-разному. Кто-то родился в Татарии, и не хватает ему в настоящий момент в Беларуси родного языка и культуры, кто-то замуж сюда вышел и по маме скучает, кто-то привык жить в большой стране СССР...

Здорово серьезные аргументы. Вот уж объединимся и заговорим сразу все по-татарски, и к маме в гости съездить бесплатный билет выдадут... Вот с Советским Союзом несколько сложнее, но гимн старый обещают точно.

...Если не жалко своих кровных и чужих учрежденческих денег на междугородние телефонные разговоры, то звоните, земляки, и дальше. Все сбудется — вам это Владимир Вольфович Жириновский, отвечая на вопрос слушателя из Беларуси, пообещал. Поскольку, по его заверению, всегда говорит честно, то откровенно сообщил: должно быть единое федеративное государство, т.е. вхождение Беларуси в состав нынешней России. Но из уважения к Лукашенко ему следует дать высокий пост, возможно, даже вице-президента. То-то он обрадуется. И мы за него. А то твердит о неком невиданном ранее миру союзе — «нечто среднее между бывшим СССР и нынешним Евросоюзом». Все будет, если будет, гораздо проще. Уже есть российско-белорусская газета «Российская Федерация». Уже четыре области Беларуси вошли в ассоциацию «Центральная Россия». А дальше по схеме, начертанной правдивым собеседником Ващанова. Правда, как долго собираются в Москве уважать Александра Григорьевича, он ничего не сказал...

Но общее впечатление от передач подобного типа — все эти радио-«Разговоры» так разговорами и останутся. Новые песни придумает жизнь... ■

TV-ПАДЗЕІ

Навіны ад РТР — кожныя дзве гадзіны

Міхась КАРПОВІЧ

Расійскія тэлеканалы прыкладаюць усё болей намаганняў, каб перамагчы ў вострай канкурэнтнай барацьбе за гледачоў. Як паведаміў дырэктар дэпартамента знешніх сувязяў Расійскай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Леў Кашлякоў, з 4 верасня інфармацыйная праграма РТР «Вести» будзе выходзіць кожныя дзве гадзіны на працягу 24 гадзінаў у суткі. Асноўны інфармацыйны выпуск будзе выходзіць у 20:00 па беларускім часе. Такім чынам, гледачы РТР стануць самымі інфармаванымі. ■

TV-СКАНДАЛ

В Венгрии прекратят показ «Секретных материалов»

Показ американского мистического телевизионного сериала «Секретные материалы» решением Верховного суда Венгрии будет перенесен с 20:00 на 23:00.

По мнению венгерских верховных судей, этот сериал «оказывает отрицательное влияние на развитие детей». По словам представителя венгерской государственной телевизионной компании МТВ, постановление означает прекращение показа сериала, так как количество рекламы на сеансе в 23:00 будет намного меньше, чем в более популярное время у телезрителей - 20:00.

Телекомпания прекратила переговоры о покупке следующих серий фильма, однако те, которые уже приобретены, будут показаны до конца в соответствии с новым расписанием. ■

TV-АСОБА

Борьба за Франца Беккенбауэра

Немецкие телевизионные каналы «RTL» и «Премьер» заплатили звезде национального футбола Францу Беккенбауэру 1,6 миллиона долларов за то, чтобы тот продолжал комментировать в прямом эфире матчи в Европейской лиге чемпионов.

Платный канал «Премьер» предложил Беккенбауэру около миллиона долларов в год за то, чтобы он комментировал матчи чемпионата. Телекомпания «RTL» добавит оставшиеся 600 тысяч долларов за то, чтобы футболист вел на ее канале передачу во время финальной стадии Евролиги - 2000.

Подобные авансы были сделаны для того, чтобы не дать компании-конкуренту «TMZ», принадлежащий австрало-американскому медиа-магнату Руперту Мердоку, «отбить» звезду национального футбола у этих двух телеканалов. ■

ЭКАНОМІКА

«XXI з'езд» адрадзіў фермер

Яўген ВЕЖНАВЕЦ, Канстанцін СКУРАТОВІЧ

Пад канец росквіту застою, калі абсалютная большасць насельніцтва Беларусі, як, уласна, і ўсей астатняй «вялікай краіны» яшчэ не ведала, што сельскай гаспадарцы пры канцы XX стагоддзя наканавана стаць стратэгічнай галінай, але ўжо адчувала ўсе хібы калектыўнага гаспадарання ўласнымі страўнікамі, з'явіўся лозунг: У кожную піянерскую сям'ю — карову і свінню!

Прынамсі, іх (лозунгаў) было болей. Чым дрэнны, прыкладам, такі: «Стварыць няцяжка аднаму трусаферму на даму!»

Але, як кажуць, не доўга музыка іграла. Наступілі 90-я, і «піянерская» жывёлагадоўля здохла. А затым народ зрабіў «свой выбар», і пачалося... Піянераў паменшала, але і ўлада наша не абы-што! Замест масавых акцыяў, заснаваных на вусных паданнях пра Мальчыша-Кібальчыша, з'явіліся селектарныя нарады, якія па відовішчнасці ды эмацыянальнай насычанасці не саступаюць канцэртам «нанайцаў». Толькі гледачы розныя: у тых — падлеткі, у гэтых — пераросткі.

Але жарты жартамі, а есці няма чаго. Будоўля рынкавага сацыялізму прывяла да поўнай «контрацэпцыі» гаспадарчага комплексу, уключаючы аграрны. І паколькі бітва за ўраджай працягваецца, дык цікавымі, на наш погляд, выглядаюць яе папярэднія вынікі. Так, 1 жніўня ў Віцебску адбылося выязное паседжанне прэзідыума Савета міністраў, а да гэтага ўвесь чэрвень «група спецыялістаў» Мінсельгасхарчу «вывучала пытанне». Вывады зрабілі непрывабныя, хоць і не новыя. Прыпіскі, тэхналагічная малапісьменнасць, неахайная праца з мінеральнымі ўгнаеннямі і насеннем і гэтак далей. На пачатак сенакосу 40 працэнтаў тэхнікі аказалася непадрыхтаванай, таму сена з першага ўкосу назапасілі толькі палову ад узроўню мінулага года. Другога ўкосу, вядома, не будзе. А мінулы год — гэта той год, калі кармы скончыліся ў снежні, яшчэ да Новага года.

Крэдыторская запазычанасць калгасаў і саўгасаў вобласці склала 12,4 трыльёна рублёў, або ў сярэднім на кожную гаспадарку па рынкаваму наяўнаму курсу прыкладна 60 тысяч долараў (па курсу Нацбанка — нашмат болей). Усё планавае гадавое бюджэтнае фінансаванне ўжо з'елі, але каб рамантаваць камбайны патрэбна 980 мільярдаў рублёў, на ГСМ для ўборкі — яшчэ 2 трыльёны. І гэта не лічачы патрэб на сяўбу азімых, уборку льну, бульбы, заработную плату, пазыкі і што там яшчэ?

Грошай папрасілі, але, як мудра заўважыў Сяргей Лінг, ні ў яго, ні ў прэзідэнта сундука з грашыма няма (цікава, куды ён дзеўся, бо казалі, што ёсць), і таму трэба разлічваць на ўласныя сілы. А потым сціпла параіў «мабілізаваць» валютныя рэсурсы мясцовых прадпрыемстваў. Інакш кажучы, экспрапрыіраваць ці заняцца рэкетам.

Ад таго, што кажуць і паказваюць СМІ, літаральна «крыша едзе». Па мясцовым тэлебачанні выступае начальнік з Лёзна і кажа, что ў гэтым годзе як ніколі нямашака ні бензіну, ні саляркі. Крыху пазней ужо «навіны» са сталіцы. У іх мінскі чын абвяргае калегу, сцвярджаючы, што няма праблемаў з графікам завозу, зацверджаным Мінсельгасхарчам. Графік выконваецца дзень у дзень. Вы б, спадары, дамовіліся адзін з адным, што і як казаць. Кожны год пасля дажынак «цар» клянецца, што болей не будзе ўтрымліваць банкрутаў, але што тыя клятвы. Віцебшчына ж наогул — зона асаблівага земляробства, бо, па адчуванні, тут даўно ўжо ўсім не ў магату. Так, у красавіку зусім мёртвы калгас «XXI партз'езд» проста аддалі аднаму з першых мясцовых фермераў В. Рашчынскаму. Прычым, ён не надта і прасіў увесь калгас, прасіў частку, але давялось браць увесь і яшчэ паабяцаць выконваць сабесаўскія абавязкі адносна старых і нямоглых. Але, цікавая рэч, да чэрвеня пагалоўе жывёлы ён павялічыў у 3 разы, а даяркам выдаў (а не толькі налічыў) заработную плату за чэрвень у 19 (!) мільёнаў.

Таму аблвыканкам ухваліў (?!) вопыт і вырашыў такім жа чынам рэанімаваць яшчэ 58 гаспадарак. Вядома, нахабства чыноўных дармаедаў нікога не здзівіць, а ўсё ж цікава, ці мае гэтае нахабства нейкія межы.

Проста, па-чалавечы, абкамаўцы працаваць не могуць. Таму вырашылі распаўсюдзіць вопыт рэфармавання аплаты працы, распачаты ў Мінскай вобласці. Сутнасць яго простая: акрамя грашовай, уводзіцца натуральная форма аплаты. Працадні, зразумела. Цікава, як хутка дойдуць да «палачак»?



І ўся гэтая мітусня на фоне згасання не толькі калгаснага, але і фермерскага жыцця. Так, па звестках мясцовай прэсы, у розных раёнах Віцебшчыны каля 20 фермераў адмовіліся ад сваіх гаспадарак. Прычыны таксама простыя: п'янства, рэкет, чыноўнае самадурства, крадзяжы. На сустрэчы фермераў у Віцебску практычна ўсе пскоўскія і смаленскія госці распавядалі, што ім прыходзіцца трымаць у штаце стаража. Адзін нават пасля чарговага падпалу ягонай сядзібы паставіў пасярод сяла шыбеніцу і паабяцаў павесіць кожнага злодзея і падпальшчыка, якога зловіць. У суседніх расійскіх абласцях паміж фермерамі і старшынямі калгасаў ідзе натуральная вайна. Старшыні, як сабакі на сене, самі, акрамя крадзяжу, нічым не займаюцца і іншым не даюць, адно толькі вярбуюць мясцовую басату на баявыя дзеянні супраць «кулаков недорезанных».

Толькі ў Смаленскай вобласці ў мінулым годзе было адзначана каля 120 падпалаў фермерскіх пабудоваў. У нас, як падаецца, усё яшчэ наперадзе. Вёска ў дэмаграфічным сэнсе абяскроўленая, сяляне співаюцца, быллём зарастаюць цэлыя паселішчы. Але тым, хто хоча і можа, працаваць не даюць. Па сведчанні начальніка галоўнага ўпраўлення кадраў і адукацыі Мінсельгасхарчу З.Лоукіса, толькі 35 працэнтаў спецыялістаў аграпрама маюць вышэйшую адукацыю. Па яго меркаванні, прычына адтоку спецыялістаў палягае ў нізкіх заробках ды празмернай занятасці. Але гэта занадта простае тлумачэнне. За прыкладам не трэба далёка хадзіць — побач Прыбалтыка. І чамусьці ў апошні час не чуваць стогнаў прыхільнікаў калгаснага ладу з нагоды гаспадарчай разрухі ў Літве, Латвіі ды Эстоніі. Бо разруха, як заўважыў класік, пануе ў галовах.

Якія і каму патрэбныя ўсялякія эксперыменты, нарады і калгасныя тэлешоу? Калі няма дзіркі ў галаве (гэта выпадак клінічны), дык рабіце так, як робяць добрыя людзі. Папытайцеся пра гэта ў тых з Заходняй Беларусі, якія яшчэ памятаюць дакалгасны лад, калі, як яны кажуць, дзверы кілбасой завязвалі. ■

УРОКІ ГІСТОРЫІ

Патрапіўшыя ў жорны

У панядзелак спаўняецца 60 гадоў з дня падпісання міжнароднага дакумента, які цалкам змяніў лёс Цэнтральнай Еўропы XX стагоддзя

Альгерд НЕВЯРОЎСКІ

23 жніўня 1939 г. дзве таталітарныя дзяржавы — гітлераўскі Трэці Рэйх і сталінскі Савецкі Саюз — падпісалі дамову аб ненападзе і сяброўстве, больш вядомую пад назваю «Пакт Молатава-Рыбентропа».

Да 1939 г. узброеныя сілы Германіі, а таксама яе эканоміка набралі дастаткова моцы, каб перайсці да канкрэтнай рэалізацыі плана Гітлера па заваяванні Еўропы. Да гэтага часу нацысты ўжо здзейснілі «аншлюс», ці далучэнне да Рэйху, «спрадвечна нямецкіх» земляў Аўстрыі і Чэхаславакіі, але ваенныя кампаніі на тэрыторыі гэтых краінаў фармальна не лічыліся вайною. У Аўстрыі фашысты правялі «ўсенародны рэферэндум» аб далучэнні да Германіі, а ўвесці войскі ў Чэхаславакію Гітлеру дазволілі заходнія дзяржавы. Каб хоць неяк суцішыць непамерныя амбіцыі нацыстаў, Францыя і Вялікабрытанія падпісалі ў сакавіку 1939 г. з Гітлерам так званую Мюнхенскую дамову, згодна з якой Рэйху было дазволена ўвесці свае войскі на тэрыторыю Судэцкай вобласці, заселенай пераважна немцамі. У выніку ж гітлераўцы акупавалі Чэхаславакію цалкам, і Захад быў вымушаны праглынуць гэты нахабны дэмарш нямецкага фюрэра.

Аднак мілітарысцкія амбіцыі кружылі галаву не толькі Адольфу Гітлеру. Бальшавіцкі Савецкі Саюз і ягоны лідэр Іосіф Сталін, які ў 20-я гады часова адмовіўся ад палітыкі экспарту рускай рэвалюцыі на Захад, адчуваў, што вялікая вайна ў Еўропе непазбежная, і таму рыхтаваўся нанесці ўдар першым. Як сцвярджаюць многія расійскія і заходнія гісторыкі, пачынаючы з 1938 г. Сталінам быў аддадзены загад аб фармаванні больш сотні новых дывізіяў і размяшчэнні іх уздоўж заходняй мяжы СССР.

У Маскве цудоўна разумелі, што найбольш моцны праціўнік бальшавікоў на Захадзе — фашысцкая Нямеччына, і савецкая дыпламатыя, і разведка шукалі любых шляхоў дзеля заключэння з Гітлерам пакта аб ненападзе. Сталін хацеў скіраваць агрэсію нацыстаў на сваіх даўніх ворагаў — ліберальна-буржуазныя Францыю і Брытанію, і, калі Рэйх канчаткова завязне ў вайне на Захадзе, ударыць па немцах з Усходу і ўсталяваць на занятых абшарах савецкую ўладу.

Гітлер жа ў сваю чаргу спадзяваўся, што падпісанне дамовы з Саветамі дасць яму магчымасць расправіцца з ненавіснай Польшчай, каб забяспечыць сабе спакойны ўсходні тыл падчас будучай вайны на заходнім фронце. Адносна ж планаў фюрэра наконт вайны з СССР думкі гісторыкаў падзяляюцца. Большасць вучоных лічаць, што Гітлер ад самага пачатку выношваў планы захопу савецкай тэрыторыі да Урала, іншыя прытрымліваюцца думкі, што план нападу на Савецкі Саюз пад назваю «Барбароса» з'явіўся толькі ў 1940 годзе, калі ў Берліне ўбачылі, што Сталін самавольна захапіў тэрыторыю Бесарабіі і Букавіны, і даведаліся, што Саветы збіраюцца пачаць сваю агрэсію супраць Захаду летам 41-га года. Але ў 39-ым абодва дыктатары сышліся ў поглядах адносна таго,

што цэнтральна-ўсходняя Еўропа павінна быць падзеленая паміж Германіяй і СССР. Бальшавікі не менш за нацыстаў ненавідзелі, на іх думку, празаходнія марыянеткавыя рэжымы прыбалтыйскіх краінаў і Польшчы і імкнуліся ўзяць у палякаў рэванш за паразу ў вайне 1920 года, калі да 2-ой Рэчы Паспалітай адышлі вялікія тэрыторыі заходніх Беларусі і Украіны.

У такой абстаноўцы Сталін і Гітлер далі даручэнні сваім знешнепалітычным ведамствам пачаць падрыхтоўку да падпісання дамовы аб сяброўстве паміж дзвюма дзяржавамі. Паміж Масквой і Берлінам адбыліся абмены візітамі кіраўнікоў міністэрстваў замежных справаў — наркома Вячаслава Молатава і барона Яхіма фон Рыбентропа. Рабочыя групы падрыхтавалі тэкст дамовы і сакрэтнага пратакола да яе, і нарэшце 23 жніўня ў сталіцы СССР пакт быў падпісаны. У тэксце самой дамовы нічога небяспечнага запісана не было. Германія і Савецкі Саюз дэкляравалі, што на працягу як мінімум 10 гадоў не будуць нападаць адзін на аднаго, будуць развіваць эканамічныя і культурныя адносіны, адным словам — дружыць. Небяспеку для іншых краінаў уяўляў менавіта сакрэтны пратакол і карта да яго, на якой былі пазначаныя падзел Польшчы і акупацыя балтыйскіх краінаў. Першапачаткова ў нямецкую зону акупацыі павінны былі ўвайсці і амаль уся тэрыторыя этнічнай Польшчы, праўда, без Варшаўскага і Люблінскага ваяводстваў, і тагачасная тэрыторыя Літвы з портам Мемель (Клайпеда), а ў савецкую — частка ўсходняй Польшчы, заходнія Беларусь і Украіна, а таксама Латвія і Эстонія. Пазней жа фашысты дамовіліся з бальшавікамі, што Літва адыдзе да СССР, а ўся этнічная Польшча — Германіі. Такім чынам немцы ўтварылі на Усходзе буферную зону ў выглядзе так званай Генеральнай губерні і аб'ядноўвалі адрэзаную раней польскай тэрыторыяй Усходнюю Прусію з астатняй тэрыторыяй Рэйха.

Бальшавікі ж у 1939 годзе пашыралі ўдвая тэрыторыі Беларускай і Украінскай савецкіх рэспублік, а годам пазней стварылі савецкія Літву, Латвію і Эстонію. Вынік гэтага, без перабольшвання можна сказаць, злачыннага пакта агульнавядомы. 1 верасня 1939 года нацысты развязалі Другую сусветную вайну, якая забрала дзесяткі мільёнаў жыццяў. Бясспрэчна, што вялікая доля віны за развязванне той страшэннай вайны ляжыць і на СССР. Калі нямецкія бомбы ў верасні 39-га знішчалі польскія гарады, Сталін віншаваў нямецкі ўрад і асабіста Гітлера з перамогай над ворагам, а савецкія і нямецкія акупанты наладжвалі сумесныя саюзніцкія вайсковыя парады ў Брэсце. Ацверазенне на бальшавікоў надышло ў чэрвені 41-га, калі немцы распачалі вайну супраць сваіх былых хаўруснікаў.

Пацярпела ад пакта Молатава-Рыбентропа і нашая краіна. Сотні цягнікоў, забітых прадстаўнікамі заходнебеларускай інтэлігенцыі, пагналі савецкія «вызваліцелі» на Усход, у ГУЛАГ. Як вядома, вярнуліся ў Беларусь з той Сібіры нямногія. Аднак усё ж такі Беларусь не была суб'ектам міжнароднай палітыкі, як нашыя заходнія ці паўночныя суседзі, таму, відаць, у гістарычнай свядомасці беларусаў пакт Молатава-Рыбентропа займае сціплае месца. А вось палякі і прыбалты заўсёды памяталі той «чорны дзень», калі быў падпісаны прыгавор іхнай незалежнасці. Таму, як толькі савецкі рэжым стаў слабым, палякі, а таксама літоўцы, латышы і эстонцы аднавілі гістарычную справядлівасць ды вярнулі свой суверэнітэт.

У 1989 г., у 50-ю гадавіну падпісання пакта, мільёны прыбалтаў выйшлі на вуліцы са свечкамі і нацыянальнымі сцягамі, узяліся за рукі і ўтварылі жывы ланцуг ад Вільні да Таліна, каб нашчадкі памяталі сваю трагічную гісторыю і не дапусцілі яе паўтарэння ў будучыні. Большасць жа беларусаў, выхаваная на савецкіх падручніках гісторыі, па-ранейшаму лічыць змову нацыстаў з камуністамі мудрым тактычным ходам Сталіна, які амаль на два гады адцягнуў пачатак вайны з гітлераўцамі. ■

памяць XX стагоддзя 1917

Шпіёнка і шпіён

Канстанцін СУРЫН

У нашай свядомасці 1917 год адзначаны дзвюма падзеямі — Лютаўскай рэвалюцыяй і бальшавіцкім пераваротам (Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя). Апошняя заўжды трактавалася як падзея, якая змяніла напрамак чалавечай гісторыі (адкрыла новую эру). Напрыканцы стагоддзя відавочна, што маштаб зменаў быў значна перабольшаны панегірыстамі. Да месца прыгадаць, што толькі мы называем дэмакратычную рэвалюцыю 1917 года Лютаўскай. Калі трымацца новага стылю, яна пачалася ў Міжнародны дзень жанчын і паводле традыцыі...

вінна адзначацца 8 сакавіка, падобна таму як свята Кастрычніцкай рэвалюцыі адзначаецца па новым стылі 7 лістапада. Такім чынам, дэмакратычную перабудову ў Расіі распачалі жанчыны, якія 8 сакавіка 1917 года выйшлі на дэманстрацыю з патрабаваннем міру і хлеба.

Ход гісторыі змянілі чатыры гады сусветнай вайны. Зруйнавалася не толькі Расійская імперыя, ачоленая чалавекам сярэдніх здольнасцяў, які сам паставіў кропку ў радаводзе сваёй дынастыі і апынуўся разам з сям'ёй пад арыштам.

У гэты ж час у Францыі знаходзілася пад арыштам жанчына, імя якой сёння больш вядомае ў свеце, чым імя апошняга расійскага імператара. Арыштаваную звалі Мата Хары, і ў шырокай свядомасці яна сімвалізуе ўдалую жанчыну-разведчыцу. Усе шматлікія тэраіні шпіёнскіх серыялаў бяруць пачатак з біяграфіі гэтай асобы. Мата Хары нарадзілася ў Галандыі ў 1876 годзе, яе сапраўднае імя — Маргарэта Гертруда Зэле. Паездка з мужам на Яву змяніла яе лёс. Тут Маргарэта захапілася мастацтвам інданезійскага танца. Менавіта з Явы яна прывезла ў Еўропу свой паэтычны псеўданім Мата хары (Вока ранку). Кар'еру знакамітай танцоўшчыцы Маргарэта пачала ў 29-гадовым узросце ў Парыжы пасля таго, як скасавала шлюб. Экзатычны стыль танцаў прынёс ёй шырокую вядомасць. Маргарэта займела багата паклоннікаў у вышэйшым свеце розных краінаў Еўропы. Пачатак сусветнай вайны, прыпыніўшы культурнае жыццё, адмоўна адбіўся на яе матэрыяльным становішчы. Даволі хутка яна засталася без сродкаў і ў гэтую цяжкую хвіліну жыцця атрымала аднолькавую прапанову ад французскай і германскай разведак. Мата Хары пагадзілася працаваць і на тых, і на тых. Жыццё двайнога шпіёна заўжды вісіць на валаску. Мата Хары не патрапіла ў лік выключэнняў. Недаверлівыя французы ўчынілі слежку за танцоўшчыцай і займелі доказы яе тайных кантактаў з нямецкім рэзідэнтам. Маргарэта Зэле была арыштаваная, і ваенны суд не ўлічыў ні ранейшай еўрапейскай славы танцоўшчыцы, ні таго, што яна жанчына. 15 кастрычніка 1917 года Мата Хары стала ля турэмнай сцяны у Венсэне, і расстрэльная каманда выканала прысуд. Ёй было 42 гады.

1917 год вывеў на арбіту сусветнай вядомасці і палкоўніка Лоўрэнса. Ён стаў героем шматлікіх фільмаў на арабскія сюжэты. У нашай літаратуры Лоўрэнс трактаваўся як цынічны, жорсткі прафесійны разведчык. На справе было інакш. Захапленнем маладога Лоўрэнса былі археалогія і мовы. У 22 гады ён патрапіў у Егіпет, дзе з ягонага рамантызму і сяброўства з арабамі скарысталася англійская разведка. Томас Лоўрэнс меў немалыя пісьменніцкія здольнасці, што засведчыла яго кніга «Сем слупоў мудрасці» (выйшла пасмяротна ў 1936 годзе). Зорным часам Лоўрэнса была арганізацыя паўстання плямёнаў Хіджаса супраць турэцкага панавання. Лоўрэнс прыняў непасрэдны ўдзел у баявых дзеяннях у пустыні і цудам застаўся жывы. Выключна дзякуючы ягонай волі і настойлівасці паўстанне перамагло, і было ўтворанае каралеўства Хіджас са сталіцай Мека.

Змены палітычнай сітуацыі прывялі да таго, што англічане не выканалі тых абяцанняў, якія давай арабам ад імя ўрада Лоўрэнс. Гэта адбілася на яго далейшым жыцці. Ён адчуваў, што ягоны гонар растаптаны, і не мог знайсці паразумення ні з урадам, ні з разведкай, ні з самім сабой. Лоўрэнс шукаў для сябе рызыкоўнага занятку. Уюжо маючы званне палкоўніка, ён пад чужым іменем пайшоў радавым у авіяцыйны атрад, каб вывучыцца на лётчыка. У 1935 годзе Лоўрэнс разбіўся на сваім матацыкле пры таямнічых абставінах. Існуе версія, што смерць Лоўрэнса арганізавала брытанская разведка, занепакоеная пісьменніцкімі поспехамі палкоўніка, што пагражала раскрыццём пэўнай інфармацыі.

Напрыканцы стагоддзя імёны Мата Хары і Лоўрэнса выкарыстоўваюцца дзеля рамантызацыі разведслужбы. У рэальнасці і Мата Хары, і Лоўрэнс мелі больш высокія мары, здольнасці і былі схільныя да больш узнёслага духоўнага жыцця, чым шпіёнскае. Нікчэмныя мэты вайны зрабілі іх сваімі ахвярамі. ■

Атрымалася як заўсёды...

Андрэй МЯТЛІЦКІ

Навагрудак — першая сталіца Вялікага Княства Літоўскага — страціў свой самы старажытны помнік культуры. Уладам не хапіла грошай, а прыватнаму прадпрымальніку-рэстаўратару — кампетэнцыі.

У мінулым годзе Навагрудак урачыста святкаваў 200-тыя ўгодкі народзінаў Адама Міцкевіча. Аляксандр Лукашэнка выдзеліў аж 1 млн. долараў на гэтую справу. У вёсцы Завоссе адбудавалі сядзібу-фальварак, дзе 24 снежня 1798 нарадзіўся паэт. Каб не смяшыць гасцей з-за мяжы, замянілі нават помнік Леніну.

На жаль, арганізатарам святаў не хапіла розуму і ведаў, каб паклапаціцца аб сапраўдным мінулым. Да пабудаванай яшчэ ў XIII ст. абарончай вежы турыстаў з Польшчы баяліся весці нават мясцовыя краязнаўцы.

Млын, пабудаваны напрыканцы XVII стагоддзя

веды. Помнік архітэктуры і культуры, які вытрымаў аблогі татараў і крыжакоў, на сёння застаўся ў стане, у якім пакінулі яго «русские освободители», што ў XVII ст. падзялілі Рэч Паспалітую. Пры Расіі вежа была перабудаваная і стала ветраком. Чарговыя «освободители»-бальшавікі забыліся на помнік. Толькі ў палове 90-х вежа прыглялася прадпрымальніку і мецэнату Пятру Сільвановічу. Былы мантажнік-вышыннік хацеў зрабіць у вежы музей. Адбудаваць вятрак, зрабіць там цэнтр народнага мастацтва. Ураджэнец бліжэйшага Асташына, дзе пасля свайго вяртання з Сібіры праклаў дарогу, ачысціў сажалкі і падключыў электрычнасць, узяўся з імпэтам за новую справу.

Ды не выйшла. Падчас работ вежа раптам завалілася. Хто вінаваты — невядома. Маўчаць мясцовыя ўлады. Маўчаць чыноўнікі па ахове помнікаў архітэктуры. Пра вежу клапоціцца толькі Сільвановіч. Зараз шукае ізноў грошы. Гэтым разам на грунтоўную рэканструкцыю. У прынцыпе зразумела: нешта ж трэба зрабіць з кучамі цэглы, якія засталіся ў выніку недасведчанасці чыноўнікаў і некампетэнтных дзеянняў рэстаўратара-аматара. ■

Тое, што засталося ад млына пасля аматарскай рэстаўрацыі

КАМЕНТАР навінаў

Звесткі пра даўніну вежы могуць быць надта перабольшаныя. У спісе гісторыка-культурных каштоўнасцяў, якія складзены Дзяржаўным упраўленнем па ахове гісторыка-культурных каштоўнасцяў міністэрства культуры РБ, навагрудскі разбураны млын датаваны XVII стагоддзем і менавіта ў гэтакай гаспадарчай якасці. Зразумела, што ні крыжакоў, ні наезды крымскіх татараў, ні князёў Міндоўга, Войшалка, Гедыміна гэты млын памятаць не мог. Хоць, зразумела, 300 гадоў існавання таксама не мала.

Больш важная праблема ў дадзеным выпадку — якім чынам помнікі архітэктуры і культуры трапляюць у рукі былых мантажнікаў-вышыннікаў, якія, набыўшы ва ўласнасць стары будынак, пачынаюць работы, для якіх не маюць патрэбнай адукацыі, вопыту і г. д. Будзе яшчэ горш, калі ўладальнік гэтай разбуранай каштоўнасці пачне саматужна адраджаць «стары млын». Рэдакцыя плануе асвятліць розныя бакі праблемы з нерухомай спадчынай у бліжэйшы час.

ТВОРЧАСЦЬ

Повенчанная с объективом и... революцией

Татьяна НОВИКОВА

В Национальном музее истории и культуры Беларуси 15 августа открылась выставка фотографии Тины Модотти «Новый взгляд. 1929».

Она продлится до 2 сентября. Ее инициатор — посольство Мексики в Москве. До приезда в Минск эта экспозиция была развернута в Москве, в Новом Манеже.

Черно-белая фотография Тины Модотти была известна в советские времена как символ революционной Мексики. Она не сходила с газетных полос повстанческой газеты «Ель Мачете». Сегодня творчество Модотти привлекает любителей фотографии всего мира. Ее имя вошло в историю наряду с Родченко.

Тина Модотти, итальянка по происхождению, была очень яркой, интересной личностью. Ее романтическая внешность знакома нам по первым немым фильмам. Она была актрисой, моделью, фотографом, агентом Коминтерна и даже работником МОПРа. Модотти была пламенной революционеркой. Идеи заставили Тину оставить карьеру фотографа в Америке и уехать в Мексику. Затем партийная судьба привела ее в СССР. В 30-е годы она жила в Москве. За свою недолгую жизнь — сорок с небольшим лет — Тина успела оставить больший след в фотографии, чем в революции. Около восьмидесяти ее фотографий сегодня хорошо известны, в их числе — «Серп и молот», «Элегантность и нищета», «Женщина с флагом». ■

«Элегантность и нищета». Мехико. 1927



«Кукурузный початок, гриф гитары и патронташ». Мексика. 1928

CINEMA

Большой успех за маленькие деньги

Егор ИВАНОВ

Фильм ужасов, на съемку которого было затрачено всего несколько десятков тысяч долларов, принес огромную прибыль его продюсерам. По данным организации Exhibitor Relations, фильм «Проект Ведьма Блэр» занял второе место по кассовым сборам в США, получив за две недели проката 29,2 миллиона долларов. Малобюджетник (на его производство было затрачено от 40 до 100 тысяч долларов) уступил лишь новой романтической комедии, в которой снялись Ричард Гир и Джулия Робертс (35 миллионов долларов — доходы от проката).

Фильм, в котором участвовали совершенно неизвестные актеры, был снят двумя молодыми американскими кинематографистами.

Снимали практически без сценария. В нем рассказывается о трех операторах, в октябре 1994 года поехавших на съемки знаменитой ведьмы по имени Блэр в лес штата Мэрилэнд на северо-востоке США. Операторы исчезли, но через три года были найдены пленки с их репортажем, из которых и составлен фильм.

Перед началом съемок троих актеров научили обращаться с видеокамерой и отправили на восемь дней в лес, чтобы они самостоятельно сняли этот фильм. Им сообщили только сюжетную канву, остальное было предоставлено на усмотрение актеров-операторов. ■

© НАВІНЫ. Спасылка на газету НАВІНЫ абавязковая. Рэдакцыя можа не падзяляць меркаванні аўтараў, публікаваць артыкулы дзеля палемікі. Адрас: г.Мінск, пр-т газеты «Известия», 8-173. Пасведчанне аб рэгістрацыі № 996
Выдаецца з 16 студзеня 1998 г. В.а. галоўнага рэдактара і заснавальнік Павел Жук. Выдавец — рэдакцыя газеты НАВІНЫ. Адрас для карэспандэнцыі: 220034, г. Мінск, вул. З.Бядулі, 6-47. Тэл./факс: 236-89-40.
E-mail: NPSvaboda@irex.minsk.by Надрукавана на паліграфічнай фабрыцы «Чырвоная зорка» (г.Мінск, 1-шы Загарадны завулак, 3) Заказ 587 Нумар падпісаны ў друк 19/08/99 (15:00) Наклад — 20.850